ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па навуковай рабоце
ўстановы адукацыі “Беларускі
дзяржаўны педагагічны
універсітэт імя Максіма Танка”
_______ А.В. Позняк

17 сакавіка 2023 г.

**ВОДЗЫЎ**

апаніруючай арганізацыі на дысертацыю
Карп Алены Аляксандраўны “Беларуская літаратурная крытыка першай трэці XX стагоддзя: эстэтычны дыскурс”, прадстаўленую на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.08 – тэорыя літаратуры. Тэксталогія

**ПРЫСУТНІЧАЛІ**: доктар філалагічных навук В.Д. Старычонак, доктар філалагічных навук Т.Я. Камароўская, доктар філалагічных навук Т.М. Тарасава, кандыдат філалагічных навук І.М. Мішчанчук, кандыдат філалагічных навук Т.У. Рацько, кандыдат філалагічных навук А.П. Жыганава, кандыдат філалагічных навук Н.В. Заяц, кандыдат філалагічных навук Н.А. Развадоўская, кандыдат філалагічных навук Н.Л. Сяржант, кандыдат філалагічных навук Т.П. Хоміч, кандыдат філалагічных навук В.Р. Хамякова.

**СЛУХАЛІ**: даклад А.А. Карп аб асноўных палажэннях і выніках дысертацыйнага даследавання “Беларуская літаратурная крытыка першай трэці XX стагоддзя: эстэтычны дыскурс”, прадстаўленага на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.08 – тэорыя літаратуры. Тэксталогія.

**ВЫСТУПІЛІ**: эксперт, прызначаны загадам рэктара БДПУ № 333л ад 20 лютага 2023 г. для правядзення экспертызы дысертацыі “Беларуская літаратурная крытыка першай трэці XX стагоддзя: эстэтычны дыскурс”, прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.08 – тэорыя літаратуры. Тэксталогія; кандыдат філалагічных навук Т.П. Хоміч прадставіла праект і абгрунтавала адлюстраваныя ў водзыве вывады.

**ПАСТАНАВІЛІ:**

На падставе вынікаў галасавання (за – 11, супраць – няма, устрымаліся – няма) зацвердзіць водзыў апаніруючай арганізацыі на дысертацыйнае

даследаванне А.А. Карп "Беларуская літаратурная крытыка першай трэці XX стагоддзя: эстэтычны дыскурс", прадстаўленае на саіскание вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.08 – тэорыя літаратуры. Тэксталогія.

**1. Адпаведнасць зместу дысертацыі заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі.**

Дысертацыя А.А. Карп "Беларуская літаратурная крытыка першай трэці XX стагоддзя: эстэтычны дыскурс" з'яўляецца самастойнай кваліфікацыйнай навуковай работай, адпавядае галіне навукі, па якой яна прадстаўлена да абароны (філалагічныя навукі), і спецыяльнасці 10.01.08 – тэорыя літаратуры. Тэксталогія, а таксама патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь, якія прад'яўляюцца да дысертацый на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

**2. Навуковы ўклад саіскальніка ў вырашэнне навуковай задачы з ацэнкай яго значнасці.**

Айчынная літаратурная крытыка за час свайго развіцця займела несумненныя набыткі, што выявілася ў выпрацоўцы метадалогіі, у складванні жанравай сістэмы, у станаўленні адметных творчых індывідуальнасцей крытыкаў-прафесіяналаў і, безумоўна, у з'яўленні многіх высакаякасных літаратурна-крытычных тэкстаў. У гэтым сэнсе крытыка першай трэці XX стагоддзя, якая стала аб'ектам дысертацыйнага даследавання А.А. Карп, уяўляе сабой надзвычай паказальны этап як па выніковасці, так і па шматвектарнасці зробленага – свае эстэтычныя прынцыпы, формы рэпрэзентацыі мела крытыка нашаніўскага перыяду, літаратурных часопісаў і аб'яднанняў 1920-х гг., а таксама крытычная думка 1930-х гг. у яе лепшых прыкладах. Упершыню ў даследаванні такога тыпу нацыянальная літаратурная крытыка першай трэці XX стагоддзя разглядаецца як цэласны працэс, што ўключае тры асобныя, але ўзаемазвязаныя перыяды. Падобны падыход пашырае асэнсаванне праблемы пераемнасці ў развіцці крытыкі і адпавядае навейшым тэндэнцыям у айчынным літаратуразнаўстве, што сведчыць пра *актуальнасць* тэмы дысертацыі.

Беларуская крытыка азначанага перыяду ў тым ці іншым ракурсе разглядалася папярэднікамі аўтара дысертацыі (працы М. Мушынскага, У. Конана, Т. Вабішчэвіч, К. Мароз, інш.). Тым не менш ступень распрацаванасці праблем, звязаных з яе асэнсаваннем, нельга лічыць дастатковай. *Актуальнасць* дысертацыі абумоўлена маладаследаванасцю нацыянальнай крытыкі першай трэці XX стагоддзя (і шырэй – беларускай крытыкі ў цэлым) у яе тэарэтычных аспектах. Паступовае стварэнне гісторыі айчыннай крытыкі, яе прыкладное вывучэнне (засяроджанасць на крытычных меркаваннях пра стан літаратуры, канкрэтных пісьменнікаў, іх творы), што паспяхова здзяйснялася ў беларускім літаратуразнаўстве, не могуць замяніць

вырашэння найважнейшых для крытыкі як самастойнага віду дзейнасці пытанняў – яе ідэйна-эстэтычных прыярытэтаў, метадаў, стратэгій, функцыянальных магчымасцей у гісторыка-літаратурным працэсе, выпрацоўкі канона і крытэрыяў ацэнкі мастацкіх твораў. Пастаноўка і комплекснае вырашэнне саіскальнікам гэтых і некаторых іншых праблемных пытанняў пацвярджае *своечасовасць* і *значнасць* дысертацыйнага даследавання.

Адпраўным пунктам навуковых рэфлексій А.А. Карп выступае паняцце "эстэтычны дыскурс", вынесенае ў назву тэмы дысертацыі. Яго семантыка высвятляецца ў ходзе аналізу тэарэтычных прац заходнееўрапейскіх філосафаў, лінгвістаў (М. Фуко, П. Серыё), а таксама прадстаўнікоў рускага літаратуразнаўства (М. Бахцін, В. Цюпа). Арыенцірам для саіскальніка вучонай ступені сталі таксама ідэі У. Конана, у рэцэпцыі якога эстэтычная думка выступае тэарэтычнай асновай крытыкі. Аўтар дысертацыі ўдакладняе сутнасць эстэтычнага дыскурсу, разглядае яго як "форму камунікацыі, узаемасувязь паміж аб'ектам, суб'ектам і адрасатам, у працэсе якой ажыццяўляецца станаўленне і сцвярджэнне (інстытуцыяналізацыя) эстэтычных паняццяў, ідэй і ўяўленняў" (с. 9).

Значным навуковым унёскам А.А. Карп у вырашэнне сфармуляваных задач даследавання з'яўляецца праведзены (з улікам камунікатыўнай прыроды крытыкі) дыскурс-аналіз літаратурна-крытычных тэкстаў, прадстаўленых у перыядычных выданнях першай трэці XX стагоддзя (газета "Наша Ніва", часопісы "Полымя", "Маладняк", "Узвышша"), а таксама ў Зборах твораў М. Багдановіча, Я. Коласа, у кнігах выбранага С. Палуяна, В. Ластоўскага і інш. Важным бачыцца зварот саіскальніка да асэнсавання і параўнання творчых індывідуальнасцей асобных крытыкаў (як вядучых, так і малавядомых дагэтуль) скрозь прызму камунікатыўных стратэгій. У выніку ярчэй высвечваюцца характэрныя рысы іх метаду, стылю, культурнага кода, раскрываецца іх уяўленне пра канон нацыянальнай літаратуры і функцыю самой крытыкі. Канкрэтны аналіз выдатна ілюструе адрознае і падобнае ў функцыянаванні нашаніўскай крытыкі, крытыкі 1920-х і 1930-х гг.

Унёскам у вывучэнне літаратуразнаўчай праблемы сувязей і ўплываў з'яўляецца разгляд у падраздзеле 2.3.2 узвышаўскага эстэтычнага дыскурсу ў плане ўздзеяння на яго некаторых канцэпцый рускай і ўкраінскай школ крытыкі. У цэлым глава 2, у якой ахарактарызаваны стан і спецыфіка літаратурна-крытычнай думкі ў часопісах "Полымя", "Маладняк", "Узвышша", вызначаецца асаблівай глыбінёй комплекснага аналізу тагачаснай крытыкі, яе ідэй, метадаў, каштоўнаснай парадыгмы.

Несумненная заслуга дысертанта – назіранні за складаным працэсам стварэння нацыянальнага канона, які выпрацоўваўся ва ўмовах суіснавання розных каштоўнасных арыентацый і стратэгій. У залежнасці ад таго, як вырашалася задача выбудоўвання канона, выяўляліся і прэферэнцыі крытыкаў, "прыхільнасць іх да эстэтычнага або сацыялагічнага падыходу" (с. 12).

Значнасць тэмы, а таксама зместу дысертацыі абумоўлена ўвядзеннем у актыўны ўжытак айчыннага літаратуразнаўства міждысцыплінарных панящяў, якімі рэдка карысталіся ці не карысталіся зусім даследчыкі беларускай літаратурнай крытыкі: “эстэтычны дыскурс”, “камунікатыўная стратэгія”, “імпліцытны чытач”, “рэпутацыя крытыка” і інш.

Саіскальнік дэманструе высокі ўзровень кампетэнтнасці, дасведчанасці ў пытаннях тэорыі крытыкі і літаратуры, гісторыі развіцця беларускай эстэтычнай думкі.

**3. Канкрэтныя навуковыя вынікі (з указаннем іх навізны і практычнай значнасці), за якія саіскальніку можа быць прысуджана навуковая ступень.**

Навізна дысертацыі А.А. Карп вынікае ўжо з вызначэння мэты і задач даследавання, з канкрэтызацыі прадмета навуковага аналізу. Яна падмацоўваецца наватарствам канцэптуальнага падыходу да беларускай крытыкі першай трэці ХХ стагоддзя ў аспекце функцыянавання эстэтычнага дыскурсу. Прадстаўленая работа – першае ў айчынным літаратуразнаўстве спецыяльнае даследаванне, у якім на матэрыяле крытычных тэкстаў разгледжанага перыяду паказана непарыўнасць, пераемнасць і дэтэрмінаванасць трох асобных этапаў у развіцці беларускай літаратурна-крытычнай думкі.

Вынікі дысертацыйнага даследавання дапаўняюць, канкрэтызуюць уяўленні пра функцыянаванне айчыннай крытыкі 1900 – 1930-х гг., а разам з гэтым пра літаратурны працэс і тагачасную сацыякультурную сітуацыю. Іх навізна заключаецца ў раскрыцці такіх маладаследаваных і недаследаваных у беларускай літаратуразнаўчай навуцы пытанняў, як фарміраванне літаратурнага канона, каштоўнасных крытэрыяў, рэпутацый крытыкаў, станаўленне прафесійнай этыкі, выпрацоўка крытычных стратэгій, функцыянаванне літаратурнага рынку (некаторыя з іх носяць міждысцыплінарны характар).

Па-наватарску, з улікам камунікатыўнай прыроды крытыкі, разгледжаны крытычныя меркаванні М. Багдановіча, С. Палуяна, В. Ластоўскага, А. Луцкевіча, У. Чаржынскага, І. Замоціна, А. Бабарэкі, Ю. Бярозкі, Я. Коласа, праведзены аналіз (у асобных выпадках параўнальны) іх эстэтычных канцэпцый. У кантэкстуальнае поле разгляду ідэй узвышаўскай крытыкі ўпершыню ўключана імя ўкраінскага даследчыка А. Бялецкага.

Навізна і дакладнасць высноў забяспечана таксама ўмелым выкарыстаннем асноватворных прынцыпаў і прыёмаў разнастайных метадаў даследавання: структурнага аналізу, дыскурс-аналізу, метаду цэласнага інтэграцыйнага аналізу, культурна-гістарычнага метаду.

Практычная значнасць дысертацыі заключаецца ў магчымасці выкарыстання яе асноўных палажэнняў і вынікаў пры напісанні падручнікаў і дапаможнікаў, падрыхтоўцы навучальных курсаў па тэорыі і гісторыі літаратуры, літаратурнай крытыцы для ВНУ. Тэкст дысертацыі пры пэўнай дапрацоўцы можна выдаць у выглядзе манаграфіі, адрасаваўшы яе

спецыялістам-філолагам, выкладчыкам і студэнтам. Канцэптуальны падыход, распрацаваны ў дысертацыі А.А. Карп, можа быць рэалізаваны пры даследаванні іншых перыядаў у развіцці айчыннай крытыкі.

**4. Заўвагі і прапановы.**

1. У Главе 1 глыбока і пераканаўча паказаны працэсы станаўлення і развіцця нашаніўскага эстэтычнага дыскурсу. Пытанне выклікае неапраўдана малая ўвага да знакавай падзеі перыяду – дыскусіі 1913 года. У сучасным літаратуразнаўстве гэта палеміка разглядаецца ў сувязі з імёнамі не толькі В. Ластоўскага, Я. Купалы і Л. Гмырака (як гэта вынікае з разважанняў дысертанта на с. 27), але і М. Гарэцкага (арт. "Наш тэатр", "Развагі і думкі"), З. Бядулі (арт. "Не хлебам адным…" друкаваўся менавіта на старонках "Нашай Нівы"), М. Багдановіча (апав. "Апокрыф" як форма выяўлення эстэтычнай пазіцыі пісьменніка) і інш. Неабходна вытлумачэнне, чаму гэтыя аўтары выпалі з поля зроку дысертанта.

2. Незаслужана абыдзена ўвагай постаць высокапрафесійнага крытыка М. Гарэцкага, які ўжо на пачатку творчага шляху вызначыў выключную ролю крытыкі ў развіцці слоўнага мастацтва: "Усякая маладая літаратура <…> асабліва мае патрэбу і ў сур'ёзнай крытыцы. <…> На добрай крытыцы гадуюцца пісьменнікі і грамадзянства, і недарма з вялікай нецярплівасцю жду я беларускага крытыка" (арт. "Развагі і думкі"). А ў 1920-х гг., актыўна працуючы не толькі над "Гісторыяй беларускае літаратуры", але і над артыкуламі для перыёдыкі, М. Гарэцкі прадэманстраваў цэласнасць разгляду літаратурных з'яў, спалучанасць сацыялагічнага і эстэтычнага падыходаў. У гады замацавання сацыялагічнага метаду пазіцыя М. Гарэцкага мела прынцыповы характар. Ён, у прыватнасці, канстатаваў: "Галоўны недахоп сучаснае беларускае крытыкі ў тым, што яна, даволі добра разбіраючыся ў ідэалагічных якасцях твора, не можа даць належнага разгляду з фармальна-мастацкага боку…" (нарыс "«Маладняк» за пяць гадоў: 1923 – 1928"). Гэтыя развагі, як і ўся практычная дзейнасць Гарэцкага-крытыка, даследчыка літаратуры, выдатна кладуцца на канцэпцыю дысертацыі А.А. Карп.

3. Падключэнне ў змест работы імён малавядомых крытыкаў надало, як адзначалася вышэй, навуковай значнасці дысертацыйнаму даследаванню. Разам з тым у асобных выпадках патрабавалася, відаць, большая канкрэтызацыя матэрыялу, увядзенне звестак пра пэўныя персаналіі і іх літаратурна-крытычныя набыткі. Так, напрыклад, на старонках 49, 56, 57 згадваецца прозвішча К. Гарабурды, аднак застаецца невядомым, дзе, калі і што ён апублікаваў.

4. Неаргументаванай падаецца тройчы паўтораная (у розных варыяцыях) рэпліка пра сучасную беларускую крытыку, "стан якой нельга лічыць аптымальным" (с. 4), "якая не з'яўляецца сёння настолькі запатрабаванай" (с. 28). Хоць бягучая крытыка не выступае аб'ектам даследавання, усё ж сур'ёзнасць заяўленай ацэнкі патрабуе доказу. Крытычная дзейнасць такіх літаратуразнаўцаў, як, напрыклад, Г. Кісліцына, Л. Сінькова, П. Васючэнка,

надзвычай прыкметная ў літаратурным працэсе пачатку XXI ст. Надзённыя праблемы беларускай крытыкі, якія, безумоўна, маюць месца ў сённяшняй культурна-грамадскай сітуацыі, разглядаюць І. Шаўлякова-Барзенка, Г. Кісліцына, М. Аляшкевіч, А. Бязлепкіна-Чарнякевіч. У кантэксце дысертацыі можна было спаслацца на зробленыя імі ацэнкі і высновы, якія тычацца стану сучаснай крытычнай думкі.

5. Дысертацыя А.А. Карп добра адпрацавана ў моўна-стылявых адносінах, тым не менш сустракаюцца асобныя недакладнасці словаўжывання (сс. 19, 23, 28, 35, 49, 72, 81, 94, 98 і інш.). Аб'ём дысертацыйнага даследавання (126 с.) перавышае колькасць старонак, рэкамендаваную ВАК Рэспублікі Беларусь.

Выказаныя заўвагі не закранаюць сутнаснай вартасці дысертацыйнай работы А.А. Карп, не змяншаюць яе навуковай значнасці.

**5. Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе.**

Дысертацыя А.А. Карп "Беларуская літаратурная крытыка першай трэці XX стагоддзя: эстэтычны дыскурс" з'яўляецца завершанай, самастойна выкананай, кваліфікацыйнай навуковай работай і адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да падобных прац. Згодна з п.п. 19–20 "Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні навуковых званняў у Рэспубліцы Беларусь" вучоная ступень кандыдата філалагічных навук Алене Аляксандраўне Карп можа быць прысуджана за:

1) самастойна выпрацаваную канцэпцыю дысертацыйнага даследавання, якая адначасна з'яўляецца прадуманым кампазіцыйным стрыжнем, – разгляд беларускай літаратурнай крытыкі першай трэці XX ст. як непарыўнага працэсу, асэнсаванне яе ў аспекце эстэтычнага дыскурсу;
2) аргументаваны разгляд этапаў, шляхоў выпрацоўкі нацыянальнага канона ў крытычным вопыце як асобных аўтараў (С. Палуяна, В. Ластоўскага, М. Багдановіча, А. Луцкевіча, У. Чаржынскага, А. Бабарэкі, Я. Пушчы і інш.), так і ў літаратурнай крытыцы першай трэці XX ст. у цэлым;
3) доказны разнавектарны аналіз шматлікіх з'яў крытычнага дыскурсу, увядзенне ў навуковы ўжытак шэрагу малавядомых ці забытых аўтараў, тэкстаў, літаратурных фактаў;
4) узбагачэнне тэрміналагічнага апарату, метадалагічнага інструментарыю айчыннага літаратуразнаўства праз даследаванне эстэтычнага дыскурсу і літаратурнай крытыкі як камунікатыўнай з'явы.

Высокі ўзровень дысертацыйнага даследавання, значная публікацыйная актыўнасць (14 пазіцый), удзел аўтара ў навуковых канферэнцыях (8) сведчаць пра адпаведнасць А.А. Карп навуковай кваліфікацыі кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.08 – тэорыя літаратуры. Тэксталогія.

У адпаведнасці з "Палажэннем аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні навуковых званняў у Рэспубліцы Беларусь" саіскальнік вучонай ступені кандыдата філалагічных навук А.А. Карп выступіла на пасяджэнні

праблемнага савета БДПУ па філалагічных навуках з дакладам па тэме дысертацыі, дала адказы на зададзеныя пытанні.

Падрыхтаваны экспертам праект водзыву на дысертацыю А.А. Карп "Беларуская літаратурная крытыка першай трэці XX стагоддзя: эстэтычны дыскурс" быў заслуханы і абмеркаваны на праблемным савеце па філалагічных навуках БДПУ.

Водзыў зацверджаны на пасяджэнні праблемнага савета па філалагічных навуках установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка" (пратакол № 6 ад 17 сакавіка 2023 года).

Старшыня праблемнага савета БДПУ
па філалагічных навуках
доктар філалагічных навук,
прафесар — В.Д. Старычонак

Сакратар праблемнага савета БДПУ
па філалагічных навуках
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт — Т.У. Рацько

Эксперт
кандыдат філалагічных навук — Т.П. Хоміч

Подпіс Старычонка В.Д., Рацько Т.У., Хоміч Т.П.
сведчу: намеснік начальніка АК БДПУ
С.Б. [illegible]
20.03.2023

Водзыў паступіў у савет па абароне дысертацый Д 01.42.04 21.03.2023г. Вуч. сакратар (Богдан А.І.)

З водзывам азнаёмлена А. Карп (Карп А.А.)
21.03.2023г.